**9 клас**
**Комплексная работа**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Утварыце і запішыце новыя словы.**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

аб+ішоў ______________________________________________________
супер+ігра ____________________________________________________
па+іменны ____________________________________________________
пост+індустрыяльны _________________________________________
спец+інструктаж _______________________________________________
без+інфляцыйны _______________________________________________
пра+ігнараваць _______________________________________________
з+іначыць_____________________________________________________

**Заданне 2. Выпішыце словы, якія складаюцца з пяці марфем.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Дагледзець, атлетыка, выгароджваць, настойлівасць, мініяцюра, няспешна, паляванне, апусценне, выбрацца, увасьмярых, заручальны, устанаўліваць, паляшучка.

**АДКАЗ:**__________________________________________________________________

____________________________________________________________________________

**Заданне 3. Запішыце беларускія адпаведнікі.**

*Максімальная колькасць балаў — 6*

| *Вывески и надписи* | *Беларускія адпаведнікі* |
|---|---|
| Баня | |
| Государственный банк | |
| Для вызова милиции нажмите кнопку | |
| Железнодорожные кассы | |
| Здравпункт | |
| Окрашено | |
| Опасно для жизни! | |
| Осторожно, злая собака! | |
| Парикмахерская | |
| Сберегательный банк | |
| Белсоюзпечать | |
| Частная автостоянка | |

**Заданне 4. Узнавіце тэкст. Для гэтага ўстаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі (*2 балы*), лічбы запішыце словамі *(2 балы)*, упішыце прапушчаныя дзеясловы (*2 балы*). Вызначце і запішыце стыль тэксту (*1 бал*).**

*Максімальная колькасць балаў — 7*

На ___маргоншчыне побач з чыгункай, якая вядзе з Мінска ў Вільню, раскінулася вялікая вёска Залессе. У яе старажытным парку сярод векавых ліп

_________________________________ валун вялікіх памераў, а на ім словы «Ценям Касцюшкі», выбітыя па-польску. Надпіс прысвечаны таленавітаму палкаводцу, якога дала свету беларуская зямля ў XVIII (_______________________________ ) стагоддзі.

Тадэвуш Касцюшка – выхадз__ц са старажытнага беларускага шляхецкага роду. Калі у 1794 ( ___________________________________________ _______________) годзе ўспыхнуў нацы__нальна-вызваленчы рух у Беларусі, Літве і Польшчы, Касцюшку прызначылі галоўнакамандуючым усіх узброеных сіл. У адным з баёў параненага Касцюшку ______________ ў палон і пасадзілі ў Петрапаўлаўскую крэпасць, дзе ён прасядзеў каля 15 (_______ _______________________________ ) месяцаў.

Пасля вызвалення Касцюшка (на)заўсёды ________________________ родную зямлю. Памёр у 1817 ( ______________________________ ____________________________) годзе ў Швейцарыі. Яго прах ____________________________ ў Кракаў і змясцілі ў склеп побач з саркафагамі польскіх каралёў.

**АДКАЗ: Стыль — __________________________________**

**Заданне 5**. **Запішыце ў пустыя клеткі табліцы адпаведныя формы слоў.**

*Максімальная колькасць балаў — 3*

| Н. скл., мн. лік | Н. скл., адз. лік. | Р. скл., адз. лік | М. скл., адз. лік |
|---|---|---|---|
| Сурвэткі | | | |
| Песні | | | |
| Быльнягі | | | |

**Заданне 6. Сёння ў беларускую мову прыйшло шмат запазычанняў, якія можна замяніць ужо існуючымі ў мове адпаведнікамі. Да кожнага з прапанаваных слоў запішыце такі адпаведнік — слова ці словазлучэнне.**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

Альтэрнатыва — __________________;
бойфрэнд — ______________;
брэнд — _______________________________;
экзіт-пул — ____________________________ ;
эксклюзіўны — __________________________;
дайвінг — ________________________________;
сінгл — _________________________________;
о-кей!— ___________________.

**Заданне 7. Раскрыйце дужкі, аднавіце фразеалагізмы і растлумачце значэнне гэтых устойлівых выразаў**

*Максімальная колькасць балаў — 10*

Браць, узяцца, пабраць, ухапіць, падаць (крошачкі, за розум, горлам, шылам, духам, кашы).

| **Фразеалагізмы** | **Значэнне** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

| Фразеалагізмы | Значэнне |
|---|---|
| | |
| | |

**Заданне 8. Выявіце ў прымаўках сродкі мастацкай выразнасці мовы. Запішыце ў пустыя клеткі назвы гэтых сродкаў.**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

| Прымаўкі | Сродкі мастацкай мовы |
|---|---|
| 1. І сцены вушы маюць. | |
| 2. І ваўкі сытыя і авечкі цэлыя. | |
| 3. Адзін з сошкай, а сямёра з ложкай. | |
| 4. Госць першы дзень золата, другі дзень срэбра, а на трэці медзь, хоць дадому едзь. | |

**Заданне 9. Знайдзіце лішні элемент у пераліку і растлумачце свой выбар:**

*Максімальная колькасць балаў — 2*

А) Барока, сентыменталізм, кульмінацыя, рэалізм, рамантызм, класіцызм.

Б) Экспазіцыя, развязка, лірызм, завязка, эпізод, кульмінацыя.

**АДКАЗ:**

**А)**______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Б)**______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Заданне 10. Устаўце прапушчаныя словы. Запішыце назву твора і яго аўтара.**

*Максімальная колькасць балаў — 5*

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не _____________-,
Каб не страціць святое штосьці.

Не забыць, як падвялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню ________ асвер
Запускае руку да пахі.

Не забыць сцежкі той, што цябе
На дарогу выводзіла з дому,
Што у хаце там быў рубель
У цане і па курсу старому.

Не забыць, як марозам злым
________ пальцы пячэ балюча
І адкуль на стале тваім
Бохан свежага хлеба пахучы.

Помніць свой на іржышчы цень,
Не забыць, як завуць суседа,
Не забыць, як пяе пад дзень
За вясёлым сталом бяседа.

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою ты стаў чысцей
І не страціў святое штосьці.

**АДКАЗ:**

**Назва твора**______________________________________________

**Аўтар**__________________________________________________

**9 клас**
**Комплексная работа**

**ДАВЕДКІ**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **4** | **5** | **6** | **7** | **3** | **4** | **10** | **4** | **2** | **5** | **50** |

**Заданне 1.**

аб+ішоў = абышоў
супер+ігра = суперігра
па+іменны = пайменна
пост+індустрыяльны = постындустрыяльны

спец+інструктаж = спецінструктаж
без+інфляцыйны = безынфляцыйны
пра+ігнараваць = праігнараваць
з+іначыць= зыначыць

**Заданне 2.** ***(1 бал за кожнае правільнае слова).***

на-стой-лів-асць□,
а-пусц-е-нн-е,
вы-бр-а-ц-ца,
за-руч-а-льн-ы,
па-ляш-уч-к-а.

***Іншыя словы*:** да-гледз-е-ць, атлет-ык-а, вы-гародж-ва-ць, мініяцюр-а, ня-спеш-н-а, паляв-а-нн-е, у-васьм-яр-ых, у-станаўл-іва-ць.

**Заданне 3.**

| **1. Вывески и надписи** | **1. Шыльды і надпісы** |
|---|---|
| Баня | Ла́зня |
| Государственный банк | Дзяржа́ўны банк |
| Для вызова милиции нажмите кнопку. | Для выкліку міліцыі наці́сніце кнопку. |
| Железнодорожные кассы | Чыгу́начныя ка́сы |
| Здравпункт | Пункт аховы здароўя |
| Окрашено | Пафарбава́на |
| Опасно для жизни! | Небяспе́чна для жыцц**я**! |
| Осторожно, злая собака! | Асцярожна, злы сабака! |
| Парикмахерская | Цыру́льня |
| Сберегательный банк | Ашча́дны банк |
| Белсоюзпечать | Белсаюздру́к |
| Частная автостоянка | Прыва́тная аўтастаянка |

**Заданне 4.** ***Каментарый. За прапушчаныя літары, раскрытыя дужкі – 2 балы), лічэбнікі – 2 балы, дзеясловы – 2 балы, стыль тэксту –1 бал.***
***Дзеясловы могуць быць сінанімічнымі. Галоўнае, каб яны адпавядалі стылю і тыпу маўлення.***

На **С**маргоншчыне побач з чыгункай, якая вядзе з Мінска ў Вільню, раскінулася вялікая вёска Залессе. У яе старажытным парку сярод векавых ліп ляжыць валун вялікіх памераў, а на ім словы «Ценям Касцюшкі», выбітыя па-польску. Надпіс прысвечаны таленавітаму палкаводцу, якога дала свету беларуская зямля ў XVIII (**васямнаццатым**) стагоддзі.

Тадэвуш Касцюшка – выхадз**Е**ц са старажытнага беларускага шляхецкага роду. Калі ў 1794 (**тысяча семсот дзевяноста чацвёртым**) годзе ўспыхнуў нацы**Я**нальна-вызваленчы рух у Беларусі, Літве і Польшчы, Касцюшку прызначылі галоўнакамандуючым усіх узброеных сіл. У адным з баёў параненага Касцюшку ўзялі ў палон і пасадзілі ў Петрапаўлаўскую крэпасць, дзе ён прасядзеў каля 15 (пятнаццаці) месяцаў.

Пасля вызвалення Касцюшка **назаўсёды** пакінуў родную зямлю. Памёр у 1817 (**тысяча восемсот сямнаццатым**) годзе ў Швейцарыі. Яго прах перавезлі ў Кракаў і змясцілі ў склеп побач з саркафагамі польскіх каралёў.

**Стыль — публіцыстычны.**

**Заданне 5.** ***Каментарый. Адзін радок – 1 бал.***

| **Н. скл., мн. лік** | **Н. скл., адз. лік.** | **Р. скл., адз. лік** | **М. скл., адз. лік** |
|---|---|---|---|

| | | | |
|---|---|---|---|
| сурвэткі | сурвэтка | сурвэткі | сурвэтках |
| песні | песня | песні | песні |
| быльнягі | быльнёг | быльнягу | у быльнягу |

**Заданне 6.**

Альтэрнатыва — *выбар*; бойфрэнд — *сябар*; брэнд — *гандлёвая марка*; экзіт-пул — *апытанне на выхадзе*; эксклюзіўны — *выключны*; дайвінг — *падводнае плаванне*; сінгл — *сольная кампазіцыя (дыск з адной песняй);* о-кей! — *так, добра*.

**Заданне 7.**

| Фразеалагізмы | Значэнне |
|---|---|
| Браць горлам | Дамагацца чаго-небудзь крыкам |
| Узяцца за розум | Рабіцца разважлівым, станавіцца разумнейшым |
| Пабраць крошачкі | Вельмі падобны да каго-небудзь |
| Ухапіць шылам кашы | Пагнаўшыся за чым-небудзь, зведаць няўдачу (часцей з-за ўласнага промаху) |
| Падаць духам | Прыходзіць у роспач, губляць надзею |

**Заданне 8.**

| Прымаўкі | Сродкі мастацкай мовы |
|---|---|
| 1. І сцены вушы маюць. | метафара |
| 2. І ваўкі сытыя і авечкі цэлыя. | паралелізм |
| 3. Адзін з сошкай, а сямёра з ложкай. | метанімія |
| 4. Госць першы дзень золата, другі дзень срэбра, а на трэці медзь, хоць дадому едзь. | градацыя |

**Заданне 9.**

**А) кульмінацыя** (элемент сюжэтна-кампазіцыйнай будовы твора; усе іншыя тэрміны абазначаюць мастацкія сістэмы).

**Б) лірызм** (характарыстыка настраёвасці, спосабу пабудовы дыялога паміж аўтарам і чытачом; усе іншыя тэрміны абазначаюць элементы сюжэтна-кампазіцыйнай будовы твора)

**Заданне 10.**

ачарсцвець, цыбаты, Клямка.

“Трэба дома бываць часцей”. Рыгор Барадулін.